УДК 9(476)

# Беларуская хрысціянская дэмакратыя: стратэгія і тактыка (1917-1939 гг.)

Багдановіч А.Г.
Беларускі нацыянальны тэхнічны універсітэт

Лагічным працягам беларускага хрысціянска-дэмакратычнага руху пачатку XX стагоддзя стала заснаванне Хрысціянска-дэмакратычнай злучнасці беларусаў – клерыкальнай нацыянальнай партыі, што ўзнікла ў маі 1917 года ў Петраградзе. Галоўнымі ідэолагамі партыі былі беларускія ксяндзы Ф.Абрантовіч, Л.Хвецка, А.Станкевіч, В.Гадлеўскі, і інш. Друкаваны орган – газета "Беларуская крыніца".

У 1920 г. былі выдадзены першыя Праграма і Статут беларускіх хрысціянскіх дэмакратаў.

З 1927 года партыя мела назву Беларуская хрысціянская дэмакратыя (БХД), з 1936 – Беларускае народнае аб'яднанне (БНА).

Сябры БХДЗ-БХД-БНА актыўна працавалі ў ТБШ, БСРГ, БЦВК і іншых арганізацыях Заходняй Беларусі.

Беларускія хрысціянскія дэмакраты адстойвалі асновы дэмакратычнага ладу, выступалі за эвалюцыйны шлях развіцця грамадства, легальныя формы барацьбы, адмоўна ставіліся да сацыялістычнай рэвалюцыі. Як прыхільнікі незалежніцкіх ідэалаў, беларускія хадэкі прытрымліваліся тэорыі самабытнасці развіцця беларускай нацыі і абуджалі нацыянальную свядомасць беларусаў на аснове хрысціянскай этыкі і дэмакратычных прынцыпаў. Сябры ХДЗБ (пазней БХД, БНА) выступалі супраць сацыяльна-класавага падыходу ў дзейнасці Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі, рэвалюцыйнага характару Беларускай сялянска-работніцкай грамады, згодніцтва паланафільскіх груповак. Яны асуджалі тэрор і ганенні заходнебеларускага насельніцтва з боку польскіх улад. З самага пачатку сваёй дзейнасці былі прыхільнікамі беларусізацыі касцёла (царквы).

Беларускія хрысціянскія дэмакраты, выпрацоўваючы ўласную стратэгію і тактыку, свядома не ішлі на збліжэнне ні з Польшчай, ні з Савецкай Беларуссю.

У праграмных дакументах БХДЗ-БХД-БНА было шмат было супярэчлівага, ідэалістычнага для ўмоў тагачаснай Беларусі. Па сутнасці, Беларуская хрысціянская дэмакратыя не сумела знайсці шырокую падтрымку сярод працоўнага насельніцтва Заходняй Беларусі, асабліва праваслаўнага веравызнання, не стала масавай палітычнай партыяй. Яе памкненні на лідэрства ў беларускім нацыянальна-вызваленчым руху засталіся нерэалізаванымі.